**Jing Jing**
Guizhou Normal University
e-mail: 570173585@qq.com

## The study of literature as a means of ideological education in teaching RCT

*Key words: ideological education, literary works, students, classes in Russian literature.*

*Ideological education is a very important part of modern classroom education, as well as an integral part of RCT education. The peculiarities of classes with literary materials provide more opportunities for ideological education. This article examines the features of literary materials from different historical periods, analyzes the possibility of implementing ideological education through literary works and discusses how best to integrate ideological education in Russian literature classes.*

**А.М. Чарнавокая**
Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі
e-mail: lecsa87@gmail.com
УДК 82.09

## ДАСЛЕДАВАННЕ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ПРОЗЫ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ І ПАДЛЕТКАЎ У АЙЧЫННЫМ ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВЕ

*Ключавыя словы: дзіцячая літаратура, падлеткавая проза, сучаснае літаратуразнаўства, Л. Рублеўская, В. Гапееў.*

*У артыкуле ўздымаецца праблема даследавання сучаснай беларускай прозы для дзяцей і падлеткаў, аналізуюцца навуковыя выданні і публікацыі Л. Алейнік, Т. Пятроўскай, Л. Іконнікавай, дзе прасочваецца развіццё асобных жанраў. Разглядаюцца раздзелы навуковых і вучэбных выданняў, прысвечаныя стваральнікам сучаснай дзіцячай літаратуры, вылучаюцца найменш даследаваныя жанры дзіцячай і падлеткавай прозы.*

Літаратура для дзяцей і падлеткаў лічыцца адной з найбольш запатрабаваных на сучасным этапе. Нягледзячы на тое, што XXI стагоддзе наўрад ці застанецца ў гісторыі культуры як літаратурацэнтрычная эпоха, дзіцячыя кнігі карыстаюцца попытам, з'яўленне новых выданняў нярэдка паўстае важнай культурнай падзеяй, а таленавітыя аўтары маюць значную папулярнасць.

Безумоўна, гэта тлумачыцца тым, што творы для дзяцей і падлеткаў могуць выконваць не толькі эстэтычную, геданістычную, сацыяльна-крытычную функцыю, але і выхаваўчую, пазнавальную, сацыяльна-інтэгратыўную. Кнігі для дзяцей нярэдка выбіраюць бацькі ці старэйшыя сваякі, каб праз супольнае чытанне і абмеркаванне акцэнтаваць важныя для сям'і жыццёвыя прыярытэты, маральна-этычныя прынцыпы. Гэта актуалізуе аксіялагічную функцыю і надае кнізе вялікае значэнне ў сямейным асяродку.

Дзіцячая літаратура вылучаецца ў якасці асобнай з'явы найперш на падставе вызначэння адрасата твора. Ці разлічаны канкрэтны твор на дзяцей ці падлеткаў? Каб адказаць на гэта пытанне чытач як правіла арыентуецца на анатацыю, афармленне, назву твора, выдавецтва, серыю ці праект, у межах якога прадстаўлена кніга. Аднак гэтыя крытэрыі не заўсёды дастатковыя, асабліва калі справа тычыцца фантастычнай, гістарычнай, экалагічнай прозы, праблемных рэалістычных твораў, якія могуць быць разлічаны як на дарослага чытача, так і на падлеткаў. Адсутнасць выразных крытэрыяў, якія дазвалялі б вылучыць прозу для падлеткаў, можна лічыць адным з фактараў, якi абмяжоўваў даследчыкаў, ускладняў пытанне вылучэння аб'екта даследавання. У 2017 годзе была ўведзена абавязковая ўзроставая маркіроўка кніг, што здымае гэту праблему, дазваляе вызначыць творы, адрасаваныя канкрэтным узроставым групам (0+; 6+; 12+; 16+; 18+), вылучыць адметнасці як дзіцячай (0+, 6+), так і падлеткавай (12+, 16+) літаратуры, прасачыць развіццё адпаведных жанраў.

Адпаведна, першачарговай задачай паўстае агляд зробленага айчыннымі літаратуразнаўцамі, вызначэнне прыярытэтаў даследчыкаў, вылучэнне найменш даследаваных жанраў сучаснай дзіцячай і падлеткавай прозы.

Адно з першых выданняў, дзе вызначаюцца асноўныя тэндэнцыі развіцця беларускай дзіцячай літаратуры канца XX ст. – пачатку XXI стагоддзя – вучэбны дапаможнік «Беларуская дзіцячая літаратура» (2008). Звяртаючыся да літаратуры 1990-х гадоў І. Кульбянкова падкрэсліла імклівае павелічэнне твораў этнаграфічнага, краязнаўчага, гістарычнага зместу (прысвечаных, у прыватнасці, старажытнай беларускай гісторыі і эпосе Сярэднявечча), а таксама з'яўленне твораў экалагічнай тэматыкі [8, с. 485–487]. Усё гэта абумовіла плённае развіццё жанраў нарыса, апавядання, абразка.

У аглядной частцы дапаможніка разглядаюцца творы Р. Бензярука, Р. Баравіковай, А. Бутэвіча. Асобныя нарысы прысвечаны стваральнікам сучаснай дзіцячай літаратуры, сярод якіх аўтары празаічных твораў – У. Ліпскі і У. Ягоўдзік. Так, Я. Клімуць прааналізаваў сацыяльна-бытавыя казкі У. Ягоўдзіка і казкі пра жывёл, апавяданні пра звяроў, рыб і птушак, у якіх пісьменнік «знаходзіць выключныя, запамінальныя рысы, асаблівасці нораву, паводзін» [8, 667]. Займальна і з гумарам напісаныя творы У. Ягоўдзіка могуць стаць першымі ўрокамі экалагічнага выхавання для маленькіх чытачоў.

«Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя» таксама змяшчае раздзелы, прысвечаныя аўтарам, якія шмат пісалі для дзяцей і падлеткаў. Гэта Э. Скобелеў, Г. Марчук, У. Ліпскі, А. Федарэнка, Л. Рублеўская. Аднак у адпаведных раздзелах творы для гэтай мэтавай аўдыторыі не з'яўляюцца цэнтральным аб'ектам увагі. Галоўным менавіта дзіцячым творцам сярод прадстаўленых аўтараў паўстае У. Ліпскі. І. Буторына падрабязна разглядзела яго кнігі «Вясёлая азбука», «Янкаў вянок», «Прыгоды Нуліка» ды іншыя пазнавальныя, навукова-папулярныя выданні і падкрэсліла скіраванасць твораў У. Ліпскага на «развіццё фантазіі і пазнавальнага інтарэсу, выхаванне лепшых маральных пачуццяў, добразычлівасці» [4, 598].

Як вынікае з агляднага раздзела І. Шаўляковай-Барзенка, найбольш яскравай тэндэнцыяй у развіцці дзіцячай літаратуры пачатку XXI стагоддзя стала «мэтаскіраваная праца па стварэнні сучаснай прозы для падлеткаў» [4, 21], «спланаваная ў выніку "калектыўнай дамовы" пісьменнікаў (Р. Баравіковай, А. Бадака, А. Наварыча і інш.)» [4, 31]. Найперш даследчыца адзначыла інтэнсіўнае развіццё жанру падлеткавай аповесці. Сапраўды, творы Р. Баравіковай, В. Гапеева, Л. Рублеўскай ды іншых празаікаў, напісаныя ў 2000-х гг., выклікалі прыкметную ўвагу як аглядальнікаў і крытыкаў, так і літаратуразнаўцаў.

Сярод першых даследчыкаў падлеткавай аповесці варта назваць Л. Алейнік. Ад разгляду твораў А. Бадака, А. Асташонка, В. Гапеева на старонках літаратурна-мастацкіх выданняў (найперш – часопіса «Полымя») даследчыца перайшла да іх аналізу ў сацыяльна-псіхалагічным аспекце, што знайшло адлюстраванне ў шэрагу навуковых публікацый.

Аб'ектам даследавання Л. Алейнік былі аповесці «Адзінокі васьмікласнік хоча пазнаёміцца» А. Бадака, «Ведзьміна тоня» В. Гапеева, раман Л. Рублеўскай «Забіць нягодніка, альбо Гульня ў Альбарутэнію» і інш. Літаратуразнаўца разглядала творы, адрасаваныя падлеткам, як фактар сацыялізацыі асобы, характарызавала іх сюжэт, тэматыку і праблематыку.

Пры аналізе прозы В. Гапеева даследчыца звярнулася да праблемы сацыяльна неўпарадкаваных сем'яў, пытанняў этыкі і маралі, стасункаў паміж людзьмі, непазбежнай неабходнасці выбару паміж дабром і злом для герояў-падлеткаў, якія знаходзяцца ў складанай жыццёвай сітуацыі [1, 125]. Творы Л. Рублеўскай разглядаліся Л. Алейнік найперш як «мастацкае адлюстраванне нацыянальнай гісторыі і яе вобразна-выяўленчая інтэрпрэтацыя» [4, с. 19] і ацэньваліся як «магутны стымул у працэсе самаідэнтыфікацыі асобы, эфектыўны сродак інкультурацыі» [2, 19].

Асноўнай навуковай працай, прысвечанай сучаснай прозе для дзяцей і падлеткаў, з'яўляецца дысертацыя Т. Пятроўскай «Беларуская дзіцячая проза пачатку XXI ст.: асноўныя тэндэнцыі развіцця» (2022), дзе аналізуюцца творы вядучых айчынных аўтараў (А. Бадак, Р. Баравікова, А. Бутэвіч, В. Гапееў, А. Карлюкевіч, А. Масла, А. Наварыч, Л. Рублеўская і інш.).

Сярод выданняў, прадстаўленых ва ўзроставай катэгорыі дашкольнікаў, даследчыца разгледзела такія віды кніг, як навучальная кніга-карцінка, казкі пазнавальнага характару з гульнёвым элементам, казкі-прыгоды жывёлы ці адушаўлёнага прадмета. У гэтых выданнях адзначаецца «перавага пазнавальнага аспекта над выхаваўчым, спалучэнне вербальнага і невербальнага кампанентаў, наяўнасць інтэрактыўнасці, гульнёвых элементаў» [10, 17].

Сярод твораў, адрасаваных малодшым школьнікам, Т. Пятроўская прысвяціла асноўную ўвагу жанрам рэалістычнага апавядання з персанажамі-дзецьмі, казкам пазнавальнага характару, казкам-падарожжам з героямі-равеснікамі [10, 18]. Даследчыца вылучыла наступныя асаблівасці сучаснай літаратурнай казкі: зварот да праблем сям'і (развод, смерць ці тайна нараджэння дзіцяці); адлюстраванне ўплыву камп'ютарызацыі; мадэрнізацыя вобразаў галоўных герояў і другасных персанажаў, вобразаў-рэчаў. Літаратурная казка можа спрыяць усведамленню этнакультурнай ідэнтычнасці дзіцяці [10, 18].

Што тычыцца сучаснай падлеткавай прозы, то тут Т. Пятроўская адзначыла наступныя жанравыя прыярытэты ў практыцы беларускіх пісьменнікаў: «твор-актуалізацыя гістарычнага мінулага, дзе найбольш вылучаецца хронафантастыка, увага ў такіх творах акцэнтуецца не на спосаб перамяшчэння ў часе, а на маральныя пераўтварэнні герояў; падлеткавыя дэтэктывы; творы з актуальнай для падлетка праблематыкай, асноўнымі тэмамі якіх з'яўляюцца ўзаемаадносіны з супрацьлеглым полам, сяброўства і адносіны да бацькоў» [10, с. 15].

Як падкрэсліла даследчыца, «звычайна падлеткавыя творы пазбаўлены дэкларатыўнай ацэначнасці і павучальнасці, увага скіравана на перажыванні галоўнага героя і яго адносіны, часта канфліктныя, з грамадствам» [10, 15 – 16]. Пры гэтым «найбольш удала раскрываюць тэму падлеткавага жыцця творы, якія ілюструюць канфлікт падлетка з акаляючым асяроддзем, першы вопыт дарослага жыцця» [10, 19]. Адметнасць сучаснай прозы для падлеткаў – змены ў вобразе значнага дарослага: «ён можа быць больш інфантыльным, засяроджаным на сваіх пачуццях, што прыводзіць да аўтаномнасці героя-падлетка» [10, с. 19].

Т. Пятроўская прааналізавала больш за сотню твораў, прадэманстравала жанравую і тэматычную разнастайнасць сучаснай беларускай дзіцячай прозы, вызначыла яе адметнасць у параўнанні з літаратурай савецкай эпохі.

Прыкметную цікавасць літаратуразнаўцаў выклікае творчасць Л. Рублеўскай і Г. Марчука. Да разгляду жанрава-тэматычнага дыяпазона прозы Л. Рублеўскай звярталіся М. Рак [11], Н. Лысова [7], К. Кушнарова [6]. Дзіцячая проза Г. Марчука разглядалася ў манаграфіі Л. Іконнікавай [5]. Сярод адметных якасцей казак гэтага аўтара даследчыца адзначыла «вялікае значэнне фальклору, які спрыяе жыватворнай сіле творчасці»

[5, 145], «парадаксальнае злучэнне старога і новага, акумуляванне традыцыйнага і наватарскага» [9, с. 145], а таксама «імкненне да цыклізацыі, якая пабудавана на канцэптуальным, кампазіцыйным прынцыпе» [5, с. 145]. Л. Іконнікава прааналізавала сюжэт, структуру і кампазіцыю твораў, прасачыла іх суаднесенасць з фальклорам, ахарактарызавала вобразы цэнтральных персанажаў.

Асобныя творы, адрасаваныя дзецям і падлеткам, разглядаліся В. Падстаўленкам [9], В. Смалем [12], Т. Гарох [3] ды іншымі літаратуразнаўцамі.

Праведзены агляд дазваляе зрабіць выснову, што найбольш даследаванымі жанрамі дзіцячай прозы на сучасным этапе з'яўляюцца казка і падлеткавая аповесць (рэалістычная, гістарычная, фантастычная). Меншая ўвага прысвечана апавяданням для дзяцей і падлеткаў. Практычна недаследаваным жанрам з'яўляецца фэнтэзі, хаця звяртаюцца да яго не толькі маладыя, але і сталыя аўтары (В. Гапееў, Р. Баравікова). Такім чынам, сучасная дзіцячая і падлеткавая беларуская проза чакае далейшага вывучэння і асэнсавання.

**Літаратура**


1. Алейнік, Л.В. Мастацкая літаратура для дзяцей і юнацтва як інстытут сацыялізацыі (на прыкладзе аповесці В.Гапеева «Ведзьміна тоня») / Л.В. Алейнік // Журнал Белорусского государственного университета. – 2020. – № 1. – С. 17–23.

2. Алейнік, Л.В. Сучасная беларуская проза для дзяцей і юнацтва як сродак інкультурацыі : (на прыкладзе рамана Людмілы Рублеўскай «Забіць нягодніка, альбо Гульня ў Альбарутэнію») / Л.В. Алейнік // Веснік БДУ : навуковы часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. – 2014. – № 1. – С. 16–20.

3. Гарох, Т.В. Хрысціянскія каштоўнасці ў казках для дзяцей і дарослых беларускай дзіцячай пісьменніцы Алёны Масла / Гарох Т.В. // Вестник образования. Гродненский регион : научно-методический журнал. – 2018. – № 4. – С. 43–45.

4. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя / У 4 т. – Мінск : НАН Беларусі, аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Цэнтр даслед. беларус. культуры, мовы і літ., 1999 – 2014. – Т. 4, кн. 3 – Мінск : Беларуская навука, 2014. – 1319 с.

5. Іконнікава, Л. Мастацкі свет твораў Георгія Марчука: драматургія, проза, казкі / Л. Іконнікава. – Мінск : Беларускі рэспубліканскі літаратурны фонд, 2013. – 203 с.

6. Кушнарова, К.В. Жанравая спецыфіка прозы Л. Рублеўскай / К.В. Кушнарова // Міжнародныя Шамякінскія чытанні «Пісьменнік – асоба – час» : матэрыялы Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, г. Мазыр, 19–20 лістапада 2009 г. – Мазыр, 2009. – С. 124–127.

7. Лысова, Н.Б. Гістарычная проза Людмілы Рублеўскай: да характарыстыкі жанру / Н.Б. Лысова // Вестник Полоцкого государственного университета : научно-теоретический журнал. – 2013. – № 10. – С. 12–17.

8. Макарэвіч, А.М. Беларуская дзіцячая літаратура / А.М. Макарэвіч і інш. – Мінск : Вышэйшая школа, 2008. – 687 с.

9. Падстаўленка, В. «Млечны шлях клікаў да сябе…»: архетып падарожжа ў зборніку «Жаласлівая каралеўна» Пятра Васючэнкі / В. Падстаўленка // Роднае слова – 2024 – №2 – С. 49–52.

11. Пятроўская, Т.М. Беларуская дзіцячая проза пачатку XXI ст.: асноўныя тэндэнцыі развіцця: аўтарэферат дыс. ... кандыд. філал. навук: 10.01.01 / Т.М. Пятроўская. – Мінск, 2022. – 31 с.

12. Рак, М.С. Жанрава-тэматычны дыяпазон прозы Людмілы Рублеўскай: традыцыі і наватарства / М.С. Рак // Весці БДПУ. Серыя 1. – 2019. – № 1. – С. 118–123.

13. Смаль, В.М. Праблемна-тэматычнае поле беларускай літаратуры для юнага чытача: гісторыка-культурны аспект / В.М. Смаль // Искусство слова в диалоге культур: проблемы компартивистики : материалы Международной научно-практической конференции, Брест, 12–13 марта 2020 года / под ред. Л.В. Скибицкой. – Брест, 2020. – С. 152–156.

**A.M. Tscharnavokaya**
The Yanka Kupala Institute of Literature Studies
the Center for Belarusian Culture, Language and Literature Research
of the National Academy of Sciences of Belarus
e-mail: lecsa87@gmail.com

## The Study of Modern Belarusian Child's and Adolescent's Literature in Contemporary Literary Criticism

*Key words: child's literature, adolescent's prose, contemporary literary criticism, L. Rublewskaya, V. Gapeew.*

*The article discusses the problem of studing of modern Belarusian child's and adolescent's literature. L. Aleinik's, T. Piatrouskaya's, L. Ikonnikava's works, dedicated to development of it's genres, are analyzed. Sections of scientific and educational publications about children's writers are examined; less investigated genres of child's and adolescent's prose are identified.*

**Ю.Д. Шабуня**
Полоцкий государственный университет имени Евфросинии Полоцкой
e-mail: y.shabunya@psu.by
УДК 821.111

## ГОТИЧЕСКАЯ ТРАДИЦИЯ В ПРОИЗВЕДЕНИЯХ А.К. ДОЙЛА

*Ключевые слова: готическая традиция, замок, мистическое, мотив, саспенс.*

*Рассматривается готическая традиция в произведениях А.К. Дойла (Arthur Ignatius Conan Doyle, 1859–1930) «Привидения в замке Горсторп-Грейндж» (The Secret of Goresthorpe Grange, 1885), «Почему в новых домах водятся привидения» (Why New Houses are Haunted, 1886), «Зеркало в серебряной оправе» (The Silver Mirror, 1909), «Тайна задёрнутого портрета» (The Veiled Portrait, 1874), «Джордж Венн и привидение» (George Venn and the Ghost, 1895). Отмечается использование элементов готической литературы для создания таинственной атмосферы и ужаса. Выявляются основные художественные приемы и мотивы в повествовании, а также выделяются особенности создания художественного пространства в произведениях А.К. Дойла.*

Артур Конан Дойл – крупнейший английский писатель ирландского происхождения. Писатель известен как мастер детективного и приключенческого жанра, кроме того, в отдельных его произведениях можно заметить присутствие необъяснимых явлений. А.К. Дойл считается классиком